Наш культурны асяродак
Жырандоля
Выпуск № 4 (492)

Юбілей

«ЗВЫЧАЙНАЯ ВІЦЕБСКАЯ МОЛАДЗЬ»

Краіна адзначае стагоддзе УНОВИСа

Увесь гэты год мы будзем адмыслова ўспамінаць салодкія часы, калі Віцебск знаходзіўся ў авангардзе сусветнага мастацтва. 2020-ы, канешне, варта было б назваць у гонар УНОВИСа: сто гадоў таму Казімір Малевіч стварыў у Віцебску арт-аб'яднанне «сцвярджальнікаў новага мастацтва», што праз агучаныя ідэі і філасофію стала сапраўднай рэвалюцыяй. Выбухная плынь супрэматызму, што паўплывала і да гэтых часоў уплывае на сферу культуры, запанавала ў Віцебскай народнай мастацкай школе і сабрала вакол сябе цяпер ужо сусветна вядомых мастакоў, скульптараў і архітэктараў. На працягу 2020 года ў Беларусі з удзелам нашчадкаў унавісаўцаў мае прайсці цэлы шэраг прысвечаных юбілею арт-суполкі мерапрыемстваў, і першае з іх адбылося ўжо на гэтым тыдні.

Хоць насамрэч, можна сказаць, святкаванне стагоддзя УНОВИСа пачалося яшчэ летась, калі ў Беларусі была ўручана Міжнародная прэмія імя Лазара Хідэкеля — аднаго з самых вядомых вучняў Шагала і Малевіча, архітэктара, стваральніка праектаў экагарадоў і гарадоў будучыні. Тады на цырымонію ўручэння з Нью-Ёрка прыехаў сын вядомага ўнавісаўца Марк з жонкай Рэгінай і сынам Раманам. Мастацтвазнаўца Рэгіна Хідэкель тады расказала, як падчас аднаго партыйнага допыту ў архітэктара запыталіся, чаму ён і яго паплечнікі бяруць прыклад з Захаду, на што той адказаў, што ўсё наадварот: гэта Захад бярэ прыклад з супрэматыстаў, і пытанне закрыў.

Так яно і было: калі самі ўнавісаўцы змаглі паглядзець тагачаснае прагрэсіўнае мастацтва Еўропы, аказалася, што эстэтыка супрэматызму шмат у чым апераджала заходнія ўзоры. Пра выключнае мастацкае аб'яднанне акуратна і даступна расказвае дакументальная стужка Яўгена Сяцько «УНОВИС», створаная летась на кінастудыі «Беларусьфільм». Публічны паказ фільма ў якасці першай у 2020 годзе прысвечанай юбілею падзеі адбыўся 22 студзеня ў кінатэатры Voka Cinema. Карціна пачынаецца з таго, як Казімір Малевіч прыязджае ў Віцебск, каб працаваць у народным мастацкім вучылішчы. Праз архіўныя кадры, фотаздымкі, дзённікі, з дапамогай шматлікіх экспертаў яна тлумачыць ідэі супрэматызму і расказвае пра гісторыю і значнасць унавісаўцаў, сярод якіх Эль Лісіцкі і Лазар Хідэкель, Мікалай Суецін, Вера Ермалаева, Леў Юдзін і іншыя.

Адзін з экспертаў дакументальнага фільма дырэктар Музея гісторыі Віцебскага народнага мастацкага вучылішча Андрэй Духоўнікаў спаслаўся на тое, што шмат якія мастацтвазнаўцы кажуць: маўляў, падобнае магло адбыцца дзе заўгодна: у Смаленску, Бранску ці Самары, куды б Малевіч ні паехаў працаваць. «...Але адбылося ў Віцебску, напэўна, таму, што горад валодае пэўным магнетызмам: тыя, хто там бываў, з гэтым пагодзяцца. У цэлым унавісаўцы сапраўды былі звычайнай віцебскай моладдзю, якая па збегу абставін аказалася пад уплывам Казіміра Малевіча, магнетызму свайго горада, рэвалюцыі і ўсіх падзей пачатку XX стагоддзя».

У віцебскім музеі адкрылася выстаўка (пад патранатам траюраднай пляменніцы заснавальніка УНОВИСа Івоны Малевіч) малюнкаў дзяцей з Беларусі, Польшчы, Іспаніі і ЗША (усяго пятнаццаці краін) на тэму віцебскай мастацкай школы. Экспазіцыя была паказана ў іспанскай Марбелы, Нью-Ёрку, а пасля Віцебска адправіцца ў Варшаву.

12—14 лютага ў Віцебску пройдзе маштабная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная стагоддзю стварэння арт-аб'яднання УНОВИС, у якой прымуць удзел Івона Малевіч, сям'я Багданавых, таксама з нашчадкаў Казіміра Малевіча, праўнучка Эля Лісіцкага Валерыя, сям'я Хідэкеляў, мастацтвазнаўцы і мастакі.

Гучнай падзеяй 15 лютага мае стаць персанальная выстава Лазара Хідэкеля, як кажуць, адна з найбуйнейшых за ўсю іх гісторыю, — з архіва сям'і архітэктара ў Беларусь прывязуць каля ста работ, напрыклад, эскізы касмічнага жылля і планы гарадоў будучыні, а таксама ўнікальныя дакументы УНОВИСа.

Апроч названых, на працягу года з'явіцца яшчэ цэлы шэраг нагод успомніць сцвярджальнікаў новага мастацтва. Ініцыятарам святкавання стагоддзя УНОВИСа стаў Цэнтр беларуска-яўрэйскай культурнай спадчыны, а падтрымку аказвае кампанія А1.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.

На кніжнай паліцы

(НЕ)ЖАНОЧЫЯ ПЫТАННІ



ЖАНЧЫНА гаворыць — у гэтым сутнасць анталогіі сучаснай беларускай драматургіі «Усё нармальна. Яе-версія». Выданне звяртае на сябе ўвагу тым, што ўтрымлівае п'есы, напісаныя выключна жанчынамі, — цяпер можна пачытаць яшчэ сем твораў. Гэтыя тэксты абралі ўкладальніцы і рэдактаркі Таня Арцімовіч, Ксенія Князева і Алена Мальчэўская. Але драматургічных твораў, аўтарамі якіх з'яўляюцца жанчыны, у Беларусі значна больш, і гэта — з'ява, вартая асобнай увагі.

...Жанчына гучна гаворыць тады, калі мае што сказаць. А тэатр — тая прастора, што дазваляе выказвацца гучна. Яе па-ранейшаму можна назваць царствам мужчын. Не, безумоўна, жанчыны-актрысы ў тэатр прыйшлі даўно і замацаваліся трывала. З жаночай рэжысурай значна больш пытанняў, хоць у Беларусі ёсць стваральніцы яркіх спектакляў і нават асобных тэатральных з'яў. А вось п'есы, напісаныя жанчынамі (ды яшчэ каб іх увасобілі на сцэне) — з'ява адзінкавая. Але не безнадзейная.

Надзея найперш на тое, што ў творы закранаюцца пытанні, якія наўрад ці агучыць мужчына, пры тым што жанчыны складаюць палову свету. Пра «надзейнасць» можна казаць з таго пункту гледжання, што тэксты драматургінь могуць прыйсці ў тэатр (а некаторыя ўжо былі пастаўленыя). Пры тым, што кнігу не аднясеш да папулярнага чытва, яе справа — спадзяюцца ініцыятары выдання анталогіі — не марная: на іх думку, адметная сама з'ява выхаду ў свет друкаванага зборніка драматургіі, а ён яшчэ мае асаблівае гучанне.

— На вокладцы мы свядома не пазначалі, што гэта жаночая драматургія. Для нас было важна, што гэта сучасная моцная класная драматургія, — адзначае **Таня АРЦІМОВІЧ**. — Мы свядома ўключылі тольки тэксты, напісаныя жанчынамі-драматургамі, і для гэтага былі падставы. Той, хто ходзіць у тэатр, мог заўважыць, што апошнім часам у Беларусі бум на аўтарства п'ес, напісаных жанчынамі, да таго ж гучыць усё больш імёнаў рэжысёрак. Ведаючы гісторыю тэатра, на гэта звяртаеш увагу. Таму што на працягу доўгага часу і не толькі ў Беларусі тэатр застаецца мужчынскім светам. Уваход туды жанчын — гэта выключэнне, подзвіг. Тое, што тут з'явілася столькі імёнаў, прымусіла нас звярнуць увагу на гэтую з'яву. Мы імкнуліся да таго, каб гэта была не проста кніга п'ес, а нешта большае.

Зборнік адкрывае тэкст, прысвечаны фемінісцкаму тэатру ў Беларусі. Гэта не значыць, што гаворка аб прадстаўніцах фемінісцкіх рухаў. Гаворка пра фемінасць — гэта гаворка пра жаночы погляд на свет: «жанчыны ў гэтых тэкстах выказваюцца пра палітычнае, дзеляцца сваімі жахамі, марамі і фантазіямі, што правакуе з'яўленне новых для беларускага тэатральнага кантэксту характараў на сцэне». І сапраўды, магчыма, знойдзецца чытач, які адкрые для сябе гэтую тэму, захоча прыслухацца да думак, каб зразумець душу, пра якую прынята казаць «загадкавая». Але, можа быць, неразгаданасць застаецца менавіта ад непачутасці? Адсюль — шмат якія жыццёвыя пытанні і праблемы, вырашыць якія можна было б шляхам простага разумення.

Таму зборнік можна назваць «драматургія+». У ім канцэптуальна прадугледжаны дыялог. Жанчынам, што ствараюць для тэатра і ў тэатры, далі прастору для выказванняў па-за п'есамі. У кнізе змешчаны тры маналогі прадстаўніц розных пакаленняў, якія вырашылі звязаць свой лёс з тэатрам: Алены Паповай, драматургіні, якую можна назваць мэтрам у айчынным тэатры, маладой аўтаркі Алены Іванюшанкі і рэжысёркі Валянціны Мароз.

Мы пазнаём імёны тых жанчын, якія існуюць у цяперашнім часавым адрэзку. Калі азірнуцца назад і згадаць перадгісторыю, то на нашай зямлі яшчэ з XVIII стагоддзя вядомае імя жанчыны-стваральніцы п'ес — Уршулі Радзівіл. Яе творы былі скіраваныя ў асноўным для хатніх пастановак.

Першай жанчынай, якая смела заявіла пра сябе менавіта як пра драматурга, стала ў XX стагоддзі Алена Папова. У той час, калі Алена Георгіеўна ўваходзіла ў тэатральны свет, яна была адзінай жанчынай сярод мужчын, якія стваралі для тэатра, і здолела дасягнуць поспеху. Яе п'есы актыўна ставіліся ў 80—90-я гады мінулага стагоддзя не толькі ў Беларусі, але і за мяжой. Пра поспех Папова выказалася так: «Выключэнняў больш, чым правіл. Правілы патрэбныя, каб не заблытацца, але выключэнняў больш. Свет значна больш шматаблічны».

Адна з праяў шматаблічнасці ў тым, што ўкладальніцам давялося няпроста, выбіраючы творы для друку. Заўсёды ёсць пытанні выбару асоб, крытэрыяў якасці.

— Мы чыталі шмат твораў, нават па некалькі разоў, праводзілі адкрытыя абмеркаванні, — удакладняе **Алена МАЛЬЧЭЎСКАЯ.** — Для мяне гэтая кніга важная тым, што яна пашырыла межы. Гэта не проста кніга, а праект. Яшчэ да таго, як яна складалася, п'есы ўвайшлі ці трапілі ў поле нашай увагі.

Анталогію «Усё нармальна. Яе-версія» можна разглядаць як частку праекта «Фармат+. Чытанні сучаснай беларускай драматургіі» Платформы перфарматыўных практык «зЕрне». Напрыклад, пры яе спрыянні ў 2019 годзе адбываліся чыткі сучаснай беларускай драматургіі ў такіх гарадах Беларусі, як Брэст, Гомель, Магілёў, Барысаў, Ліда. П'есы былі прачытаныя непрафесійнымі тэатральнымі калектывамі, а таксама тымі, што не належаць да сферы аматарскага тэатра. Укладальніцы анталогіі адзначаюць, што практыка чытак, а таксама конкурсаў і фестываляў сучаснай беларускай драматургіі вельмі істотная для аўтараў: яны атрымліваюць зваротную сувязь, пачынаюць пісаць больш актыўна. Жыццё тэксту можа пачынацца не толькі з пастаноўкі на сцэне, а непасрэдна з моманту ўзаемадзеяння з аўдыторыяй.

— Гэтае выданне паказвае, наколькі шырокае поле для дзейнасці ў гэтай галіне, — лічыць Ксенія Князева. — Гэтыя тэксты высокага ўзроўню і з тэатральнага пункту гледжання заслугоўваюць, каб на іх звярнулі ўвагу. Я б хацела, каб іх яшчэ можна было ўбачыць у тэатрах.

Чаму? Адказ просты: жанчыны ўздымаюць у драматургічных творах тэмы, адрозныя ад тых, што непакояць мужчын. Іншы погляд на жыццё — іншыя болевыя кропкі. І калі ўжо жанчына вырашыла выказацца, то часам гатовая рабіць гэта даволі адкрыта і бескампрамісна. У зборніку можна пачытаць п'есы, створаныя ў апошнія дзесяць гадоў, якія не друкаваліся раней: Алёны Іванюшанкі, Кацярыны Чакатоўскай, Улады Хмель, Марыі Бяльковіч, Рымы Ушкевіч, Юліі Шаўчук, Анастасіі Васілевіч. І гэта ўсё не толькі пра жанчын.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Кінакрокі

Што з нашага парадку дня трапляе ў «афіцыйнае» дакументальнае кіно

СВАВОЛЬНЫЯ ТРАДЫЦЫІ, ПОСТЧАРНОБЫЛЬСКІ РАЙ І КАМП'ЮТАРНЫЯ КУРСЫ ДЛЯ ПЕНСІЯНЕРАЎ

У пачатку кожнага года — гэта традыцыя — журналісты, крытыкі і зацікаўленыя кінематаграфісты некалькі дзён глядзяць створаныя за апошнія дванаццаць месяцаў фільмы студыі дакументальнага кіно «Летапіс». То-бок абсалютную большасць беларускіх дакументальных фільмаў, што, як вядома, здымаецца на «Беларусьфільме» і падтрымліваецца бюджэтам. Кажуць, былі часы, калі прагляды расцягваліся на два тыдні; я памятаю, як глядзець апроч крыўдных трынаццаціхвілінак не было чаго. 2019-ы аказаўся плённым годам, у якім грошы і магчымасці знайшліся як для прызнаных аўтараў — напрыклад, Віктара Аслюка і Галіны Адамовіч, — так і для ідэй маладых і нават пачынаючых рэжысёраў. А значыць, непасрэдна Беларусі ў кіно захавалася яшчэ больш.

За тым, з чаго складаецца выніковая падборка, пра што і як «Летапіс» здымае і нават якія аўтары змаглі рэалізаваць свае ідэі на Нацыянальнай кінастудыі, даволі займальна назіраць. Кінапраекты па-ранейшаму фінансуюцца праз перамогу на міністэрскім конкурсе, куды можна падаць заяўку, сочачы толькі, каб яна ўпісвалася ў адну з прапанаваных тэм і ўлічвала патрабаванні да фармату (ёсць меркаванне, што спіс лотаў складаецца з улікам праектаў, якія на кінастудыі ўжо існуюць).

Адпаведна, тыя чатырнаццаць дакументальных фільмаў, знятых на «Летапісе» ў мінулым годзе, пэўным чынам адлюстроўваюць разуменне Мінкультам задач сферы кіно, а за апошнія гады, трэба заўважыць, яно значна эвалюцыянавала.

Гэтым разам студыя «Летапіс», выглядае на тое, павінна была звярнуць увагу на тэмы нацыянальнай культуры, гісторыі, прыроды, спорту, катастрофы на Чарнобыльскай АЭС і соцыуму. Іншае пытанне — як рэжысёры над імі папрацавалі, а відаць, што прынамсі некаторыя з аўтараў змаглі рэалізаваць уласныя ідэі і як вынік — гэтым разам «Беларусьфільму» ёсць чым пахваліцца.

* * *

Нацыянальная культура гарэзліва загучала ў фільме Юрыя Цімафеева **«Фальклор і жыццё»**. У першай сцэне камера тэлевізійным планам здымае супрацоўніцу музея, якая паважна расказвае пра ўнікальную калекцыю старажытных ідалаў. «Альбо фаласаў», — дадае яна, камера пераходзіць на збор і становіцца зразумела, што карціна не такая простая. Мясцовы жыхар паказвае так званы *уеў лес, дзе гэтыя фаласы знаходзілі пачкамі, і фільм пачынае перескокваць з аднаго сведчання старажытнасці беларускай культуры на другое. Са свавольнымі жартамі, аголенасцю, русалкамі, вянкамі і метафарамі (першая шлюбная ноч, напрыклад, кандова паралеліцца з засяваннем зямлі) аўтары паказваюць беларускія традыцыі праз узнаўленне іх сучаснікамі, што носіць больш ігравы характар, але ўсё яшчэ добра ілюструе то смешнае, то пяшчотнае, то містычнае мінулае.

За спорт з фільмам **«Les Rameurs. Дні на вадзе»** ўзяўся Дзмітрый Махамет, за якім ужо маюцца прынамсі дзве карціны — «Мяжа Нарвілішак» і «Ты сюды больш не вернешся» — у стылі медытатыўнага назірання. Са сваёй фільмаграфіяй Дзмітрый можа лічыцца адным з найбольш цікавых і своеасаблівых беларускіх дакументалістаў, але сюжэту пра вучняў школы-інтэрната па веславанні ў Мастах яго манера падышла дрэнна. Камера даволі нудна плыве па буднях вясковых хлопцаў, што праз спартыўнае веславанне маюць шанц трапіць у «вышэйшую лігу», і іх трэнера Уладзіміра Парфяновіча. Праз адсутнасць акцэнтаў, халоднасць да вады і «чыстую» дакументальнасць стужка, так здаецца, робіць і без таго руцінную сферу спорту яшчэ большай руцінай.

За гісторыю ўзяліся рэжысёр Яўген Сяцько і Уладзімір Мароз — часты сцэнарыст фільмаў «Летапісу», вядучы рэдактар студыі, рэдактар ледзь не кожнай яе карціны, а цяпер яшчэ і галоўны герой фільма **«Мяжа»** пра ўз'яднанне Усходняй і Заходняй Беларусі ў 1939 годзе. Уладзімір у паліцечку і капелюшы карцінна паходжвае па лясах і дарогах і паэтычна расказвае, як мяжа паміж дзвюма Беларусямі адбілася на яго сям'і, а ў цэлым — як восемдзесят гадоў таму дзве часткі сучаснай краіны сталі адной. У выпадку з гістарычным фільмам асабліва цікава адзначаць ракурс падачы, і ў «Мяжы» ён, зразумела, пафасны і адназначны, хоць некаторыя лыжкі дзёгцю ў падзеях 1939 года, для парадку, усё ж былі агучаныя. У цэлым жа гаворка тут ідзе, маўляў, пра адну з самых значных падзей у гісторыі краіны, і хоць гэта праўда, недавер да фільма, калі ён праслаўляе нешта так непрыкрыта, усё ж прысутнічае.

* * *

Віктар Аслюк, адзін з самых значных беларускіх дакументалістаў, правёў пэўны час з участковым міліцыянерам Аляксандрам Клямятам з Мядзельшчыны і праз яго паказаў жыццё непрывабнай, неахайнай, нецвярозай правінцыі, а ў канцы перанакіраваў увагу і злавіў у маўклівасці свайго галоўнага героя чуллівыя шматсэнсы. Прэм'ера стужкі **«Абход»** адбылася яшчэ падчас кінафестывалю «Лістапад». Участковы аказаўся найпрыдатнейшым персанажам для таго, каб паказаць, якім можа быць жыццё. Некалі і я рабіла рэпартаж са змены сталічнага ўчастковага, і калі адзін выпівоха, якога мы наведвалі, крыкнуў мне: «Пайшла вон!» — я ўжо зразумела, што гэты досвед не забуду ніколі. З «Абходам», асабліва яго канцоўкай, мы ўсведамляем эмацыянальны фон, які мяркуе пасада героя, і бачым распаўсюджанасць «чарнухі». Мы бачым бездапаможных у сваіх слабасцях людзей і тое, што іх шмат, што жывуць яны ў няўтульных хацінках і што ім гэта фіялетава, што некаторыя не могуць паставіць свой подпіс і што бабулі бяззубымі ратамі спяваюць песні, клічучы смерць.

Галіна Адамовіч узялася за тэму — бясспрэчна, найважнейшую ў нашым грамадстве — хатняга гвалту. Карціна **«Добрых дзяўчынак не б'юць»** паказвае, куды жанчын, што аказваюцца ахвярамі маральных і фізічных гвалтаўнікоў, прыводзіць жыццё. Некалькіх гераінь — у створаны энтузіястамі прытулак, некаторых — у турму. Хтосьці вяртаецца да агрэсара, і тут трэба задаць пытанне, дзе жанчына можа знайсці падтрымку, каб гэтага не рабіць. А пачынаецца фільм са слоў дзяўчыны-падлетка, якая прызнаецца, што не сустракала мужчын, якія б неслі жанчыне нешта добрае. Страшная рэальнасць прывяла яе да сур'ёзных псіхалагічных праблем і жадання зрабіць сабе балюча. Некалькі паралельна расказаных гісторый, дзе і слёзы, і ўцёкі, і шрамы на целе, і дыктафонны запіс тырады агрэсара, і краты з-за дурных бацькоў ці мужоў, падводзяць да галоўнай думкі фільма — нам патрэбен закон, які б бараніў жанчын ад аб'юзараў і ўлічваў паводзіны гвалтаўнікоў у прысудах за перавышэнне самаабароны. Стужка дапамагае прынамсі ўсвядоміць існаванне сацыяльнай праблемы, калі не трагедыі, і яе маштаб, а таксама перадае несправядлівае адчуванне бездапаможнасці і бяссілля, якое патрабуе з ім нешта зрабіць.

«Невядомы рай»
Дар'і ЮРКЕВІЧ.

* * *

Адна карціна з падборкі 2019 года паказала, што пры ўсіх неспрыяльных умовах, якія, па словах творцаў, існуюць на Нацыянальнай кінастудыі, тут можна стварыць нешта выключнае і ад перашкод незалежнае. У фільме **«Невядомы рай»** маладая рэжысёрка Дар'я Юркевіч вельмі выкшталцона рэалізавала тэму чарнобыльскай катастрофы, якая амаль дакладна была прадыктавана кінастудыі. Яна паехала ў так званую зону з правам на адсяленне і спынілася ў сям'і маці з чатырма дзецьмі. Праз іх сціплае жыццё і штодзённыя клопаты фільм паказвае постчарнобыльскую тэрыторыю, постчарнобыльскае жыццё і постчарнобыльскую свядомасць. Сям'я жыве ў простым доміку, дзеці вучацца ў небагатай на вучняў школе, вялікая гаспадарка патрабуе ўдзелу кожнага з персанажаў, а ні на адным з іх фільм не затрымліваецца настолькі, каб паказаць у якасці асобы. Героі зліваюцца з наваколлем, якое складаецца з назіральна злоўленых дэталяў марудлівай паўсядзённасці, і мімікруюць пад яго постапакаліптычны настрой. «Невядомы рай» з'яўляецца сапраўднай знаходкай і прыкладам таго, як можна працаваць з шырокімі тэмамі і як можна працаваць на «Беларусьфільме».

Ужо некалькі гадоў на Нацыянальнай кінастудыі робяцца альманахі, якія запрашаюць да работы пачынальнікаў з іх уласнымі ідэямі. Чарговы з іх быў аддадзены дакументалістам. Сярод чатырох кароткаметражных работ, а аўтары з імпэтам здымалі, напрыклад, пра жыццёвыя абставіны людзей з абмежаванымі магчымасцямі, знайшлася цудоўная трынаццаціхвілінка **«Усе мерапрыемствы па плане»** Алеся Лапо. У цэнтры ўвагі — малады і самаахвярны дырэктар сельскага Дома культуры Дзяніс Дашкевіч, які апроч традыцыйных канцэртаў-дыскатэк хоча прапаноўваць жыхарам аграгарадка нешта большае. Гэтым «большым» становяцца камп'ютарныя курсы для пенсіянераў, і вакол прасоўвання ініцыятывы будуецца ўвесь фільм. Супрацоўнікі Дома культуры абмяркоўваюць ідэю на планёрцы, прымацоўваюць аб'яву і нарэшце асабіста ходзяць запрашаць патэнцыйных зацікаўленых, што становіцца ядром стужкі. Гэта жартаўлівы і ў той жа час сумны фільм пра закаснеласць свядомасці і паўсядзённасць беларускай глыбінкі, што не вітае развіццё. Як бы клопат з агародамі, чытай — свядомасць, супрацьстаіць прагрэсу.

* * *

Атрымаўшы шырэйшыя магчымасці, «Летапіс» апроч сваіх пастаянных аўтараў запрасіў навічкоў. І выйграў. Так, студыя павінна была стварыць чарговы фільм-візітоўку, дзе патэтычна і маляўніча расказваецца пра культурнае багацце краіны («Спадчына» Людмілы Клінцовай), альбо задаволіць патрэбы дзяржаўнай ідэалогіі. Але ў той жа час змагла закрануць сапраўды важныя для краіны пытанні кшталту хатняга гвалту і адлюстраваць выкшталцонай моваю кіно Беларусь і яе сутнасць. Да таго ж у якасці сцэнарыстаў і рэжысёраў сябе праявілі маладыя аўтары «збоку», якія пачыналі ў так званым незалежным кіно, а цяпер сваёй работай, асабліва паспяховай, два супрацьлеглыя лагеры неяк прымірылі. Хай з кампрамісамі, але «Летапіс» гэтым разам прадэманстраваў пэўныя перамогі, а значыць, гэта быў добры дакументальны год.

Сафія ПАЛЯНСКАЯ.